УДК930.2-77(476)

# ВЫКЛАДЧЫКІ “ЗАКОНУ БОЖАГА” РЫМСКА-КАТАЛІЦКАГА ВЕРАВЫЗНАННЯ Ў НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ МІНІСТЭРСТВА НАРОДНАЙ АСВЕТЫ Ў СЯРЭДЗІНЕ XIX ст. (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ФАРМУЛЯРНЫХ СПІСАЎ (НГАБ))

**Антановіч Зінаіда Васільеўна,**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*Прыводзіцца агульная характарыстыка асабовага складу выкладчыкаў вучэбнай дысцыпліны “Закон Божы” для навучэнцаў рымска-каталіцкага веравызнання сярэдніх навучальных установў міністэрства народнай асветы Расійскай імперыі. Улічваючы значнасць іх уплыву на фарміраванне светапоглядаў новага пакалення, выкладчыкі павінны былі мець спецыяльную адукацыю, досвед парафіяльнай работы і прызванне да педагагічнай дзейнасці. Іх кандыдатуры ўзгадняліся з канфесіянальным кіраўніцтвам, але зацвярджэнне на пасадзе, утрыманне і ўзнагароды за выкладчыцкую дзейнасць рымска-каталіцкае духавенства атрымлівала з казначэйства або сродкаў навучальнай установы.*

У сярэдзіне XIX ст. атрыманне адукацыі не было масавым, а выпускнік навучальнай установы параўнальна з неадукаванымі і малаадукаванымі слаямі насельніцтва меў шырокія магчымасці працаўладкавання і самарэалізацыі. Таму, высокія патрабаванні прад’яўляліся як да арганізацыі навучальнага працэса, так і да выкладчыцкага складу. У сярэдніх навучальных установах, да якіх адносіліся мужскія і жаночыя гімназіі, прагімназіі, вучылішчы дзяржаўнай і недзяржаўнай форм уласнасці [10, арт. 1463], адной з абавязковых дысцыплін з’яўляўся “Закон Божы”.

Зыходзячы з таго, што права навучацца мелі асобы розных веравызнанняў [10, арт. 1487], прадугледжвалася забеспячэнне навучання неправаслаўных навучэнцаў пры магчымасці святарамі адпаведнай канфесіі з дазволу органаў дзяржаўнай улады, а ўтрыманне выдавалася з казны або ўласных сродкаў установы адукацыі [10, арт. 1478]. Пры гэтым, калі пэўныя даследчыкі звярталіся да характарыстыкі асабовага складу выкладчыкаў з ліку праваслаўнага духавенства Расійскай імперыі, то рымска-каталіцкае імі амаль не закраналася, хаця яны ўдзельнічалі ў выхаванні навучэнцаў у Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай і іншых губернях, чым абумоўлены іх уплыў на фарміраванне светапогляду маладога пакалення [1; 3; 4]. Крыніцамі ажыццяўлення падобных даследаванняў з’яўляюцца архіўныя фонды навучальных і канфесіянальных установў [5]. Выкарыстанне першых выклікае складанасці па прычыне іх дакументальна і храналагічна абмежаванай захаванасці, а ў другіх падставовай крыніцай выступаюць фармулярныя спісы духавенства [2, с. 89–97; 6–9]. Яны дазваляюць высветліць падрыхтоўку, досвед і далейшыя лёсы выкладчыкаў “Закону Божага” рымска-каталіцкага веравызнання ў сярэдзіне XIX ст.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Выкладчыкі з ліку вопытнага рымска-каталіцкага духавенства (ва ўзросце каля 40 гадоў) абіраліся кіраўніцтвам навучальных устаноў па папярэднім узгадненні з канфесіянальным кіраўніцтвам і зацвярджаліся на пасадзе Апекуном навучальнай акругі [10, арт. 1515, 1735]. Напрыклад, Пётр Валіцкі быў зацверджаны на пасадзе настаўніка Закону Божага бабруйскага дваранскага вучылішча 16 верасня, а прыступіў да выканання сваіх абавязкаў 24 верасня 1854 г. [6, арк. 3 адв.–5; 11, s. 4.]. Святары часта сумяшчалі парафіяльныя абавязкі і выкладчыцкую дзейнасць, як Эдуард Дубовік, які быў вікарыем Мінскага катэдральнага касцёла, выкладчыкам царкоўнай абраднасці і спеваў у мінскай семінарыі і настаўнікам Закону Божага ў Мінскім дзіцячым прытулку ў 1862 г. [6, арк. 34 адв.–35; 11, s. 5]. Адначасова некалькі пасад у навучальных становах займаў Юзаф Вальдэн – у віцебскай губернскай гімназіі, павятовым і ланкастарскім вучылішчах, школе для бяднейшых дзяўчынак [7, арк. 286–289; 8, арк. 153–158; 9, арк. 125–132]. Пры гэтым у апошняй ён працаваў бясплатна. Пасля паўстання 1863–1864 гг. благанадзейнасць выкладчыкаў павінна была пацвярджацца, а іх прызначэнне адбывалася па распараджэнні губернатара, як у выпадку Браніслава Завусцінскага, які ў 1865 г. прызначаны настаўнікам мужчынскай і жаночай Мінскіх гімназій [6, арк. 6 адв.–8].

Аплата за выкладчыцкую дзейнасць прызначалася з дзяржаўных або ўласных сродкаў навучальнай установы. Так, на пасадах выкладчыка Закону Божага ў Першым і Другім мінскіх народных вучылішчах вікары Казімір Пацынка атрымоўваў 60 руб. [6, арк. 8 адв.–10]. Адначасова 150 руб. у Чэрыкаўскім павятовым вучылішчы атрымоўваў мясцовы вікары Ігнаці Чарняўскі [9, арк. 82 адв.–83]. Навучальнымі ўстановамі маглі кампенсавацца асноўныя выдаткі святарам, для якіх гэта было асноўным месцам працы. Напрыклад, Аляксандру Янкоўскаму, выкладчыку бабруйскай прагімназіі, 40 руб. выдзялялася на арэнду кватэры ад міністэрства народнай асветы [6, арк. 264 адв.–266].

Іншыя памеры ўтрымання былі ў гімназіях. Так, у пінскай гімназіі на аналагічнай пасадзе будучы канонік мінскай капітулы Францішак Яшчолт атрымліваў 400 руб. [9, арк. 264 адв.–266]. Пры сумяшчэнні пасад Юзаф Вальдэн як выкладчык гімназіі атрымліваў 400 руб., а вучылішча – 150 руб. Іншыя выкладчыцкія абавязкі ён выконваў бясплатна [9, арк. 125–132]. Утрыманне залежала таксама і ад узроўню адукацыі святара. Напрыклад, выкладчыкам сестрацэвіцкага павятовага вучылішча ў Санкт-Пецярбургу ў 1856 г. з утрыманнем 310 руб. з’яўляўся магістр Багаслоўя Францішак Клімашэўскі. Яго пераемніку на гэтай пасадзе ў 1863 г. Міхаілу Ручынскаму плацілі 300 руб. Цікава, што абодва атрымалі гэтае прызначэнне адразу пасля ардынацыі [8, арк. 896 адв.–897; 9, арк. 373 адв.–374, 377 адв.–378].

Акрамя ўтрымання, за значны ўнёсак у адукацыю і выхаванне выкладчыкаў маглі ўзнагароджваць. Напрыклад, Фама Плахоцкі выкладаў Закон Божы ў слуцкай гімназіі. За сваю дзейнасць ён атрымаў 160 руб. прэміі, а па прапанове міністра народнай асветы ў 1859 за 25-гадовую службу – пажыццёвую пенсію (200 руб.) [6, арк. 96 адв.–98]. Пахвальны ліст ад Апекуна віленскай навучальнай акругі, а таксама прэміі ў памеры 100 і 140 руб. атрымаў Аляксандр Капцэговіч [6, арк. 210 адв.–212]. Шэраг пасад у Санкт-Пецярбургу займаў Гіяцынт Навіцкі, які



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

за працу ў выхаваўчым таварыстве для шляхетных дзяўчынак і Аляксандраўскім вучылішчы быў узнагароджаны ўдзячнасцямі [9, арк. 359 адв.–362], як і настаўнік Закону Божага палтаўскага інстытута для шляхетных дзяўчынак і кадэцкага корпуса Сікстус Бабан. Апошні таксама атрымаў прэмію ў памеры паўгадавога заробку і залаты гадзіннік [9, арк. 438–439].

Такім чынам, у навучальных установах міністэрства народнай асветы ў сярэдзіне XIX ст. нарматыўнымі актамі Расійскай імперыі была забяспечана рэлігійная адукацыя навучэнцаў, шляхам уключэння ў адукацыйную праграму дысцыпліны "Закон Божы". Яго выкладалі прадстаўнікі духавенства канфесіі, да якой належалі навучэнцы, у тым ліку рымска-каталіцкай царквы. Іх колькасць абумоўлівала неабходнасць наяўнасці адпаведнага выкладчыка, якім з'яўляўся мясцовы пробашч або вікары. Да апошніх прад'яўляліся патрабаванні па адукацыйным узроўні і досведзе душпастырскай дзейнасці, што абумоўлівала іх узрост. У рэдкіх выпадках пасады маглі займаць выпускнікі семінарыі або духоўнай акадэміі (Ф. Клімашэўскі, М. Ручынскі). Яны зацвярджаліся на пасадзе свецкім кіраўніцтвам па ўзгадненні з дыяцэзіяльным біскупам, зыходзячы са здольнасцей. За выкананне выкладчыцкіх абавязкаў ім выплочвалася ўтрыманне з дзяржаўнай казны або сродкаў навучальнай установы ў залежнасці ад яе ўзроўню (звычайна ад 60 да 400 руб.). Пры гэтым у дабрачынных навучальных установах яны працавалі бясплатна. Акрамя таго за поспехі ў выкладчыцкай дзейнасці прадстаўнікі духавенства маглі атрымліваць матэрыяльныя (ад 100 да 200 руб., залаты гадзіннік) і ганаровыя (падзяка) ўзнагароды. Нягледзячы на гэта, выкладчыцкая дзейнасць для прадстаўнікоў рымска-каталіцкага духавенства з'яўлялася пераважна прызваннем.

## Літаратура


1. Алметева, И.В. Законоучители земских училищ марийского края во второй половине XIX – начале XX вв. // [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/zakonouchiteli-zemskih-uchilisch-mariyskogo-kraya-vo-vtoroy-polovine-xix-nachale-xx-vv. – Дата доступа: 05.03.2020.
2. Антановіч, З.В. Архівы Магілёўскай і Мінскай рымска-каталіцкіх кансісторый: гісторыя, структура, склад дакументаў (1782–1918 гг.). – Мінск: Экоперспектива, 2016. – 226 с.
3. Ефремова, У.П. Начальное образование и преподавательские кадры церковно-приходских школ на урале в конце XIX – начале XX в. // [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/nachalnoe-obrazovanie-i-prepodavatelskie-kadry-tserkovno-prihodskih-shkol-na-urale-v-kontse-xix-nachale-xx-v. – Дата доступа: 05.03.2020.
4. Зянюк, Р. Адукацыйная дзейнасць рымска-каталіцкага духавенства ў Гродне ў канцы XVIII – XIX ст. // Гарадзенскі палімпсест. – Мінск, 2012. – С. 195–207.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 466, 497, 1176, 2254, 2262, 2272 і інш.
6. НГАБ. – Ф. 937. Воп. 6. Спр. 107.
7. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 25. Спр. 149.
8. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 25. Спр. 150.
9. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 25. Спр. 151.
10. Об учебных заведениях министерства народного просвещения // Свод законов Российской империи / Сост. Н.П. Балканов, С.С. Войт, В.Э. Герценберг / под ред. И.Д. Мордухай-Болтовского. – Санкт-Петербург: Русское книжное товарищество «Деятель», 1896. – Т. XI. – Ч. 1. – С. 41–459.
11. Ordo divini officii et missarum pro archidioecesi Mohiloviensi. – St. Petesbourg: Imperiae de Th. Stellowski, 1865 – 148 s.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова